**ГОНАР ФАКУЛЬТЭТА**
Першакурснікі БДУ сталі прызёрамі Міжнароднай студэнцкай алімпіяды
Стар. 2

**ІНТЭЛЕКТ І ТЭХНАЛОГІІ**
Беларуская каманда ўзяла верх на RoboCup
Стар. 3

**ВУЧОБА БЕЗ МЕЖАЎ**
Акадэмічная мабільнасць у БДУ
Стар. 4

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

21 лістапада 2025 года, №11 (2302)

# БДУ ЎВАЙШОЎ У ТОП-25 НАДЗЕЙНЫХ ПАРТНЁРАЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ КІТАЯ

**Спіс уключае аўтарытэтныя ВНУ свету, адзначаныя дадзеным статусам і высокай ацэнкай дзейнасці. Усяго кітайскае ведамства вылучыла 25 давераных універсітэтаў для заключэння пагадненняў аб сумеснай падрыхтоўцы спецыялістаў, запатрабаваных у прыярытэтных галінах кітайскай эканомікі. Сімвалічна гэты топліст адлюстраваны на тэматычнай Сцяне даверу ў Міністэрстве адукацыі КНР, куды БДУ занесены першым.**




Статус БДУ як надзейнага партнёра замацаваны ў пагадненні аб стратэгічным супрацоўніцтве з Кітайскім цэнтрам адукацыйных абменаў Міністэрства адукацыі КНР. Цырымонія падпісання адбылася 6 лістапада падчас афіцыйнага візіту дэлегацыі беларускай ВНУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём у Кітай.

– *Уваходжанне ў спіс 25 ВНУ-партнёраў Міністэрства адукацыі КНР – гэта прызнанне на высокім узроўні якасці і аўтарытэту БДУ, адлюстраванне высокага рэйтынгу даверу да беларускага ўніверсітэта і адукацыі,* – пракаментаваў Андрэй Кароль ацэнку кітайскіх калег.

Пагадненне аб стратэгічным супрацоўніцтве, са слоў рэктара, прадугледжвае ўзаемадзеянне двух бакоў у галіне міжнароднага адукацыйнага абмену. Гаворка ідзе пра рэалізацыю сумесных праектаў у сферы акадэмічнай мабільнасці студэнтаў і выкладчыкаў. Гэта распрацоўка праграм па падрыхтоўцы кітайскіх грамадзян да навучання ў БДУ, правядзенне для іх кансультацый, адаптацыйных мерапрыемстваў. Таксама ў дакуменце разглядаюцца магчымасці абмену інфармацыяй і вопытам, работы з выпускнікамі, павышэння іх канкурэнтаздольнасці на рынку працы і інш.







Першым крокам да рэалізацыі вызначаных мэт стала адкрыццё сэрвіснага цэнтра БДУ на базе Кітайскага цэнтра адукацыйных абменаў.

– *Гэта наша афіцыйнае прадстаўніцтва ў Кітаі,* – падкрэсліў Андрэй Кароль значнасць дзейнасці новай структуры. Яна дазволіць кітайскім грамадзянам лепш даведацца пра БДУ, пашырыць іх кантынгент ва ўніверсітэце, а таксама ўмацаваць партнёрскія сувязі дзвюх краін. У прыватнасці, плануецца праводзенне прафарыентацыйных мерапрыемстваў для кітайскіх абітурыентаў па пытаннях паступлення і навучання ў беларускай ВНУ. Дарэчы, сёння, са слоў Андрэя Караля, асаблівая цікавасць да БДУ адзначана з боку кітайскай моладзі. Ва ўніверсітэце навучаюцца каля 3,8 тысяч грамадзян Паднябеснай. Актыўна вядзецца праца па рэалізацыі новых сумесных адукацыйных праграм, навуковых даследаванняў і канферэнцый.

Яшчэ адной важнай падзеяй візіту дэлегацыі БДУ ў Кітай стаў удзел у Пекінскім форуме «Гармонія цывілізацый і росквіт для ўсіх». Маштабнае навуковае мерапрыемства прысвечана тэме суіснавання цывілізацый у эпоху лічбавага інтэлекту. Яно арганізавана ў 22 раз і прайшло пад эгідай Пекінскага ўніверсітэта, Пекінскай муніцыпальнай камісіі па адукацыі і Інстытута перспектыўных даследаванняў Чэя. Традыцыйна форум збірае каля 500 навукоўцаў, вядучых экспертаў у галіне адукацыі, эканомікі, палітыкі, гісторыі прыблізна з 60 краін і з'яўляецца ўнікальнай пляцоўкай для дыялогу па сучасным трэндзе развіцця чалавецтва. Сёлета міжнародная сустрэча накіравана на абмеркаванне тэхналагічных інавацый, выкарыстанне лічбавых інструментаў для паляпшэння супрацоўніцтва ў эпоху хуткіх змен.

Усяго працавалі 13 секцый форуму. На секцыі «Адукацыя праз 10 гадоў: практыкі і рэфлексіі ў эпоху лічбавага інтэлекту» з тэматычным дакладам «Штучны інтэлект у люстэрку адукацыі: праблема дыялогу» выступіў Андрэй Кароль. Кіраўнік беларускай ВНУ адзначыў актуальнасць і своечасовасць заяўленай тэматыкі. З пазіцыі педагогікі, на думку навукоўца, нейрасеткі маюць розныя наступствы для чалавека і сістэмы адукацыі ў цэлым. Шмат у чым штучны інтэлект з'яўляецца сур'ёзным бар'ерам для развіцця інтэлектуальных і фізічных здольнасцяў, творчых навыкаў, умення весці дыялог і ўзаемадзейнічаць.

– *Лічбавыя тэхналогіі працуюць на эканомію часу, але на шкоду комплекснаму фарміраванню асобы,* – растлумачыў прафесар. Пры гэтым правільны педагагічны падыход укаранення штучнага інтэлекту ў навучальны працэс адкрывае вялікія магчымасці. Для гэтага важна сфарміраваць у выкладчыка патрэбныя кампетэнцыі, якія дазволяць яму быць своеасаблівым арганізатарам дыялогу студэнта са штучным інтэлектам. Выкладчыку важна «перазапусціць» навучальныя праграмы з акцэнтам на інтэрактыўны адукацыйны кантэнт і ўкараненне ШІ. У БДУ, як растлумачыў Андрэй Кароль, на рашэнне дадзеных задач накіравана сістэма эўрыстычнага навучання на аснове дыялогу. Адным з яе прызначэнняў з'яўляецца фарміраванне эўрыстычных кампетэнцый, якія дазваляюць быць «адкрытым» да інавацый, іх укаранення і стварэння ўмоў для ўсебаковага развіцця студэнта.

– *Вельмі важна навучыць выкладчыка гэтаму. У БДУ мы гэта робім на пастаяннай аснове, праводзім навучальныя семінары, курсы,* – зрабіў акцэнт Андрэй Кароль.

Таксама ў рамках візіту ў Кітай для пашырэння міжнародных сувязяў, узмацнення экспартнай лініі, стварэння дадатковых сэрвісаў для замежных студэнтаў кіраўніцтва БДУ правяло шэраг двухбаковых сустрэч з кітайскімі партнёрамі, сярод якіх Кітайскі цэнтр адукацыйных абменаў Міністэрства адукацыі Кітая, Пекінскі цэнтр замежных талентаў пры Міністэрстве працоўных рэсурсаў і сацыяльнага забеспячэння, сталічны педагагічны ўніверсітэт, Наньчанскі авіяцыйны ўніверсітэт, Хайнанскі інстытут праграмных тэхналогій, Пекінскі ўніверсітэт.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
21 лістапада 2025 года, №11 (2302)

# ГОНАР ФАКУЛЬТЭТА: ПЕРШАКУРСНІКІ БДУ СТАЛІ ПРЫЗЁРАМІ МІЖНАРОДНАЙ СТУДЭНЦКАЙ АЛІМПІЯДЫ

**Першакурснікі хімічнага факультэта БДУ Аляксандр Наліўка і Андрэй Яфрэмаў прадэманстравалі выдатныя веды і навыкі. Яны заваявалі золата і серабро на IV Міжнароднай студэнцкай алімпіядзе па хіміі, якая прайшла ў Ашхабадзе. Усяго ўдзельнікамі фінальнага тура ў Туркменістане сталі больш за 250 студэнтаў з 11 краін.**



## ДАВЕДКА

Міжнародная хімічная алімпіяда (МХА), таксама вядомая як IChO (International Chemistry Olympiad) – гэта штогадовы хімічны турнір для школьнікаў, накіраваны на папулярызацыю гэтай навукі сярод моладзі ва ўсім свеце. Кожная краіна накіроўвае каманду, якая складаецца максімум з чатырох вучняў і двух кіраўнікоў. Хоць МХА – асабістае першынство, камандная праца мае надзвычай важнае значэнне.

Першая МХА адбылася ў Празе ў 1968 годзе і з таго часу праводзіцца штогод, за выключэннем 1971 г. Спачатку ў ёй удзельнічалі пераважна краіны Усходняй Еўропы.

Спаборніцтва складаецца з двух тураў: тэарэтычнага і практычнага, кожны працягласцю да пяці гадзін у розныя дні. На тэарэтычным туры можна набраць да 60 балаў, на практычным – да 40. Вынікі падсумоўваюцца, вызначаючы агульнае месца ўдзельніка. Міжнароднае журы, у якое ўваходзяць кіраўнікі каманд, распрацоўвае заданні і перакладае іх на розныя мовы. Краіна, якая плануе ўдзел у МХА, спачатку на дзве алімпіяды накіроўвае назіральнікаў.

## УДЗЕЛЬНІЧАЕМ НЕ ЎПЕРШЫНЮ

Студэнты БДУ пацвердзілі высокі ўзровень хімічнай адукацыі ў краіне, заняўшы прызавыя месцы на прэстыжным міжнародным спаборніцтве. Падрыхтоўка да алімпіяды ажыццяўлялася пад кіраўніцтвам дэкана хімічнага факультэта Аляксандра Зураева і асістэнта кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі Данілы Леанкова. Паводле слоў Аляксандра Зураева, хлопцы ўдзельнічаюць у падобных мерапрыемствах не ўпершыню:



*– Яны ўваходзілі ў склад зборнай Рэспублікі Беларусь на Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіядзе гэтага года ў Бразіліі. А пасля мы разам з імі прымалі ўдзел у Міжнароднай хімічнай алімпіядзе IChO 2025, якая праходзіла ў Дубаі (Аб'яднаныя Арабскія Эміраты). Таму гэтая алімпіяда з'яўляецца своеасаблівым лагічным працягам, толькі з больш камбінаванымі і складанымі заданнямі, якія прапануюцца для вырашэння студэнтам хімічных спецыяльнасцяў,* – тлумачыць дэкан.

Хлопцы ўдзельнічалі ў катэгорыі студэнтаў хімічных спецыяльнасцяў, і падрыхтоўка ва ўсіх была адпаведная.

*– Калі гаварыць пра каманду Расійскай Федэрацыі, то гэта студэнты з багатым алімпіядным досведам, прычым яны навучаюцца на старэйшых курсах хімічнага факультэта МДУ. Гэта дастаткова моцныя канкурэнты, і заданні на алімпіяду таксама былі даволі аб'ёмныя і складаныя, канечне, крыху адрозныя па ўзроўні ад тых, што вырашаюць школьнікі,* – адзначае дэкан.

Падрыхтоўка пачалася задоўга да паездкі ў Туркменістан, адразу пасля рэспубліканскай алімпіяды сярод вучняў 11-х класаў, у якой хлопцы таксама ўдзельнічалі. Аляксандр Зураеў звярнуў увагу на іх патэнцыял яшчэ тады, калі яны былі школьнікамі. Для іх арганізоўвалі асобныя лекцыйныя і лабараторныя заняткі, якія дапамаглі раскрыць іх здольнасці як у вырашэнні хімічных задач, так і ў развіцці нестандартнага мыслення пры выкананні эксперыментальных работ.

Самі студэнты распавядаюць, што падрыхтоўка была для іх звыклай, аднак мела свае нюансы. Як адзначыў Аляксандр Наліўка, самым складаным было сабрацца і засяродзіцца на працы. А ўжо на самой алімпіядзе гэта было яшчэ цяжэй, бо час на выкананне заданняў быў вельмі абмежаваны. Але папярэдні досвед удзелу ў міжнародных спаборніцтвах дапамог сабрацца з думкамі і годна выступіць.

Сярэбраны прызёр Андрэй Яфрэмаў распавёў, што падрыхтоўка да такіх маштабных мерапрыемстваў у асноўным грунтуецца на вывучэнні вялікай колькасці тэарэтычнага матэрыялу – розных падручнікаў і лекцый, а таксама на рашэнні вялікай колькасці задач павышанага ўзроўню складанасці. Важную ролю адыгрываюць дысцыпліна і настойлівасць, таму адпачынак часам адыходзіць на другі план. Але і пра яго, вядома, не забывалі.

## МОРА ЎСПАМІНАЎ І НОВЫХ ЗНАЁМСТВАЎ

Сёлета арганізатарамі алімпіяды выступілі Міністэрства адукацыі Туркменістана і Туркменскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Махтумкулі. І пра арганізацыю, як і пра саму краіну, студэнты адгукаюцца вельмі добра:

*– Уражанні ад удзелу выключна станоўчыя. Акрамя таго, алімпіяда дазволіла паглыбіць веды ў розных напрамках хіміі і завесці даволі шмат знаёмстваў – як у межах БДУ, так і з прадстаўнікамі ўніверсітэтаў розных краін,* – падзяліўся Андрэй Яфрэмаў.

*– Мне ўсё вельмі спадабалася! А час у Туркменістане мы праводзілі не толькі за рашэннем алімпіядных заданняў, але і наведваючы мясцовыя славутасці. Самае галоўнае, што я вынес для сябе, ніколі не пераставаць вучыцца, даведвацца новае, знаёміцца з людзьмі. Ніколі не ведаеш, дзе і як табе спатрэбяцца веды,* – падзяліўся сваім досведам Аляксандр Наліўка.

Дэкан хімічнага факультэта таксама падкрэсліў высокі ўзровень арганізацыі алімпіяды, адзначыўшы атмасферу сяброўства і добразычлівасці. Нашы студэнты і кіраўнікі засталіся пад уражаннем ад хімічнага факультэта краіны-арганізатара, што дазволіла скласці ўласнае ўяўленне пра навучальны працэс за мяжой і пераняць карысны досвед.

## ДЗЯКУЙ, БДУ!

Як адзначаюць самі пераможцы, за іх поспехам стаіць не толькі асабістая настойлівасць і талент, але і неацэнны ўклад выкладчыкаў. Без іх ведаў, досведу і натхнення гэты трыумф быў бы немагчымы.

*– Перш за ўсё я ўдзячны свайму школьнаму настаўніку, які дапамог мне палюбіць хімію і пачаць удзельнічаць спачатку ў Беларускай хімічнай алімпіядзе, а потым і ў міжнародных спаборніцтвах. Таксама хочацца адзначыць выкладчыкаў БДУ – менавіта дзякуючы іх карпатлівай працы мне ўдалося дасягнуць такіх вышынь,* – дзеліцца Аляксандр Наліўка.

*– Выкладчыкам хацелася б выказаць асаблівую ўдзячнасць за іх уклад у паляпшэнне нашых ведаў, здольнасцяў і вынікаў. Калі б не яны, пра гэта нават не магло б ісці гаворкі. Падчас падрыхтоўкі мы вельмі зблізіліся, што, спадзяюся, дазволіць нам працягваць плённае супрацоўніцтва,* – адзначае Андрэй Яфрэмаў.

Выкладчыкі і кіраўніцтва хімічнага факультэта БДУ поўныя рашучасці і ў далейшым аказваць усебаковую падтрымку сваім студэнтам, каб пацвярджаць высокі ўзровень ведаў і ўмацоўваць лідарскія пазіцыі БДУ на міжнароднай арэне. А з такімі таленавітымі і матанакіраванымі студэнтамі, як Аляксандр і Андрэй, новыя перамогі не за гарамі.

**Таццяна САВІЦКАЯ**

# ІНТЭЛЕКТ І ТЭХНАЛОГІІ: БЕЛАРУСКАЯ КАМАНДА ЎЗЯЛА ВЕРХ НА ROBOCUP

**У сярэдзіне лістапада ў Абу-Дабі скончыўся маштабны міжнародны чэмпіянат па робататэхніцы, які аб'яднаў больш за 700 удзельнікаў з 22 краін. У напружанай барацьбе ў адной з ключавых катэгорый, «футбол колавых інтэлектуальных робатаў RoboCup Junior Soccer Lightweight», залатым прызёрам стала каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Студэнты Міхаіл Майструк, Глеб Давідовіч і Уладзіслаў Голік не толькі падняліся на найвышэйшую прыступку п'едэстала, пакінуўшы ззаду зборныя Расіі і Паўднёвай Карэі, але і прадэманстравалі ўнікальную распрацоўку – робата, цалкам створанага сіламі ўніверсітэцкай каманды. Іх перамога стала вынікам бліскучага праграмавання, і доўгага шляху, поўнага бяссонных начэй, імгненных рамонтаў і тактычных азарэнняў.**







Шлях беларускай каманды да міжнародных спаборніцтваў па робафутболе стаў прыкладам таго, як настойлівасць, інтэлект і зладжаная праца могуць кампенсаваць сціплае абсталяванне. Іх гісторыя пачалася значна раней за сам турнір.

– *Падрыхтоўка канкрэтна да турніру пачалася яшчэ ў ліпені, але варта ўдакладніць, што мы не першы раз удзельнічаем у гэтай катэгорыі, ужо паўтара года, і пабывалі на многіх спаборніцтвах у Беларусі і Расіі,* – патлумачыў капітан каманды Глеб Давідовіч.

Намінальна да чэмпіянату RCAP 2025 каманда рыхтавалася з пачатку лета, але, па словах Уладзіслава Голіка, велізарны пласт працы быў выкананы яшчэ раней, уключаючы паспяховае выступленне на адборачным этапе ў Томску, дзе яны занялі трэцяе месца і атрымалі запаветную квоту.

Фарміраванне каманды пачалося ў канцы 2023 года. Як расказаў Глеб, першапачаткова ён заснаваў яе і быў адзіным удзельнікам, але пазней прыцягнуў Міхаіла і Ігара, сваіх аднакласнікаў па Ліцэі імя Ф. Э. Дзяржынскага БДУ. На ролю трэнера запрасілі Уладзіслава, сябра Глеба і вопытнага ўдзельніка спаборніцтваў. Ролі размеркаваліся так: Глеб займаўся разводкай плат і зборкай, Міхаіл – 3D-мадэляваннем і оптыкай, а Ігар – праграмаваннем. Уладзіслаў адзначыў важны прынцып іх аб'яднання:

– *Кожны займаўся тым, што ў яго лепей атрымлівалася, аднак усе члены каманды мелі агульнае ўяўленне пра праект: праграміст у выпадку чаго мог скруціць механізм, які выйшаў з ладу, а інжынер-мадэліст адкалібраваць камеру і датчыкі.*

Цэнтрам іх жыццядзейнасці стаў мінскі хакерспейс. Міхаіл Майструк апісвае яго як унікальнае месца:

– *Напэўна, гэта адно з найлепшых месцаў у Беларусі для любой некамерцыйнай інавацыйнай дзейнасці. Менавіта там праходзілі бяссонныя ночы перад выездам.*

Тыповы дзень Міхаіла ў разгар падрыхтоўкі быў вельмі насычаным: прачнуцца, бегчы на пары, затым у хакерспейс, працаваць над праектам, бегчы на апошні трамвай у 0:01, дарога дадому, сон. Істотную падтрымку аказаў факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ, які прапанаваў кансультацыі і дапамогу ў пошуку спонсараў.

Нягледзячы на сціплую апаратную частку, дзе платы рабіліся самастойна на фрэзеры, а не заказваліся на вытворчасці, галоўнай сілай каманды стала праграмная начынка і тактыка. Як растлумачыў Уладзіслаў, іх робат адрозніваўся збалансаванай механікай з упорам на прыладу захопу мяча – дрыблер.



– *З дапамогай нашага дрыблера мы захоплівалі мяч, адводзілі яго з зоны бачнасці супернікаў, аб'язджалі іх і забівалі галы з павароту. На адладку гэтага механізма і тактыкі сышло больш за год.*

Самым напружаным момантам чэмпіянату стаў паўфінал супраць магутнай каманды з Харватыі. Гэта ўскладнялася няштатнай сітуацыяй: непасрэдна перад матчам, як успомніў Глеб, парваліся сіліконавыя ролікі, і іх давялося тэрмінова мяняць. Уладзіслаў так апісаў той матч:

– *У першыя 30 секунд матча нам удалося закаціць ім два мячы, але затым на працягу некалькіх хвілін харваты зраўнялі лік. Першы тайм мы скончылі ўнічыю.*

Дзякуючы вопыту мінулых спаборніцтваў хлопцы ведалі, што пайсці не так можа абсалютна ўсё, таму з сабой у іх была мабільная майстэрня для абслугоўвання робата і нават невялікі 3D-прынтар. З такім наборам і вопытам цяжкасці не ставілі каманду ў ступар і вырашаліся ў кароткія тэрміны. У перапынку беларускія студэнты змаглі адладзіць тактыку, а ў другім тайме дабіліся перамогі з адрывам у тры галы.

Што тычыцца будучыні, хлопцы плануюць працягваць займацца робататэхнікай. Глеб упэўнены, што іх каманда будзе жыць і ўдасканальвацца. Міхаіл, хоць і сумняваецца ў выбары канкрэтнай прафесіі, адзначае, што RoboCup хутчэй за ўсё застанецца з ім на некалькі гадоў. Уладзіслаў жа бачыць у гэтых спаборніцтвах працяг раней абранага шляху. Сваю кар'еру ён таксама хоча звязаць з робататэхнікай, паколькі лічыць кірунак перспектыўным.

Іх поспех наглядна дэманструе, што сучаснае тэхналагічнае лідарства нараджаецца на стыку фундаментальнай адукацыі, практычнага асяроддзя і моцнай каманды. Гэтая перамога не канчатковы пункт, а ўпэўнены старт. Планы ў каманды грандыёзныя: вучоба, новыя спаборніцтвы і стажыроўкі. Іх гісторыя даказвае, што ў робататэхніцы XXI стагоддзя самы каштоўны рэсурс – веды, настойлівасць і смелыя ідэі.

**Марыя КАРКВЕЛІС**

УНІВЕРСІТЭТ
21 лістапада 2025 года, №11 (2302)

# ВУЧОБА БЕЗ МЕЖАЎ: АКАДЭМІЧНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ У БДУ

**Студэнты БДУ рэгулярна ўдзельнічаюць у праграмах акадэмічнай мабільнасці. Магчымасцяў шмат, і за час вучобы можна паспець скарыстацца не адной. Праграмы акадэмічнага абмену становяцца ўсё больш актуальнымі для нашых студэнтаў. Глабалізацыя, развіццё міжнароднага супрацоўніцтва паміж ВНУ, імкненне моладзі да новых ведаў і культурнага вопыту робяць акадэмічную мабільнасць часткай сучаснай адукацыі.**

Вучоба за мяжой не проста пра «змяніць абставіны», а магчымасць займець новыя знаёмствы, палепшыць веданне замежных моў, паглядзець на сваю спецыяльнасць па-іншаму і стаць больш упэўненым у сабе.



**Васіліна Казлоўская**, студэнтка факультэта журналістыкі, даведалася пра праграму абмену выпадкова. Вясной намеснік дэкана па міжнароднай дзейнасці зрабіў аб'яву наконт магчымасці прайсці навучанне ў некалькіх гарадах Расіі. З прапанаваных былі Ніжні Ноўгарад, Варонеж, Пскоў і Калінінград.

Дзяўчына выбрала Балтыйскі федэральны ўніверсітэт імя Імануіла Канта. Калінінград прыцягнуў Васіліну не толькі акадэмічнымі магчымасцямі, але і атмасферай – асаблівай культурай, гісторыяй і архітэктурай горада, які захаваў еўрапейскі дух. Па словах студэнткі, удзел у абмене стаў выдатным досведам і ў навучальным, і ў асабістым сэнсе:

– *Раю не баяцца спрабаваць нешта падобнае: гэта сапраўды шанец убачыць, як адной і той жа спецыяльнасці навучаюць у розных месцах, і развіцца прафесійна.*

Акрамя абмену на семестр, у студэнтаў ёсць і іншыя варыянты міжнароднага навучання. Можна правесці за мяжой або ў партнёрскай ВНУ ўсяго некалькі тыдняў, напрыклад, удзельнічаць у летняй школе, прайсці моўны інтэнсіў або анлайн-курс. Нават не з'язджаючы далёка, можна паглыбіцца ў іншае акадэмічнае асяроддзе і павысіць узровень валодання замежнай моваю.



Паэтапна развівалася гісторыя акадэмічнай мабільнасці **Ульяны Мажанавай**, студэнткі факультэта міжнародных адносін. Першая яе паездка ў Кітай доўжылася чатыры тыдні. Вучоба праходзіла ў групе, дзе сабраліся студэнты з Беларусі, Расіі, Карэі, Манголіі і іншых краін. Размаўлялі ў асноўным пакітайску – гэта хутка дапамагло пераадолець моўны бар'ер.

– *Кітай – гэта быццам іншая планета. Іншая культура, ежа, рытм жыцця — і ўсё цікава.*

Праграма была насычанай: заняткі па кітайскай мове, майстар-класы па каліграфіі і традыцыйных рамёствах, экскурсіі. Ужо дома Ульяна зразумела, што хоча вярнуцца, але на больш доўгі тэрмін. Праз паўгода яна зноў апынулася ў Кітаі, цяпер па праграме Інстытута Канфуцыя. Гэтая паездка патрабавала больш падрыхтоўкі: трэба было здаць экзамен HSK, сабраць медыцынскія даведкі і партфоліа. Вучоба таксама была больш падобная да сапраўднай: пяць прадметаў, рэгулярныя тэсты і цалкам лічбавізаваны ўлік. Але, па словах Ульяны, выкладчыкі былі вельмі добразычлівыя і падтрымлівалі студэнтаў. Акрамя вучобы, Ульяна з цікавасцю назірала за кітайскай сістэмай адукацыі і традыцыямі. Яе ўразіла, як уся краіна замірае падчас уступных экзаменаў:

– *Спыняецца ўвесь рух, каб школьнікам было камфортна здаваць экзамен – гэта неверагодная павага да адукацыі.*

Сёння Кітай застаецца адным з наймацнейшых партнёраў БДУ, і студэнты ўсё часцей выбіраюць менавіта менавіта гэту краіну.



Беларускіх студэнтаў у Азіі можна сустрэць не толькі ў Кітаі, але і ў арабскіх краінах. Напрыклад, **Ян Цераxаў**, студэнт гістарычнага факультэта, зараз праходзіць навучанне ў Султанаце Аман. Ён прызнаецца, што вялікіх цяжкасцяў не было – арганізацыйныя пытанні ўзяў на сябе Інстытут імя Султана Кабуса. Асноўным выклікам стала адаптацыя да мовы: выкладанне вядзецца цалкам на арабскай:

– *Спачатку было складана разумець мясцовы дыялект, але праз пару месяцаў я ўжо добра ўспрымаў арабскую мову на слых.*

Культурнага шоку не адбылося – да асаблівасцяў Блізкага Усходу ён быў гатовы. Цікава, што выкладчыкі ў Амане ведаюць пра Беларусь, хоць у асноўным па навінах. Пасля візіту султана Хайсама бен Тарыка ў Мінск цікавасць да нашай краіны прыкметна вырасла.



А вось **Надзея Апановіч**, студэнтка факультэта журналістыкі, вырашыла паехаць яшчэ далей – у Малайзію. Для яе абмен стаў вялікім жыццёвым вопытам:

– *З'явілася шмат знаёмых па ўсім свеце, я зразумела, як неабходныя ў жыцці камунікацыя і адаптацыя. Я навучылася ўліваца ў іншую культуру і пашырыла свой светапогляд.*

Да паездкі дзяўчына амаль нічога не ведала пра краіну, але менавіта гэта дапамагло ёй па-сапраўднаму адкрыцца новаму досведу:

– *Я ведала, што Малайзія – мусульманская краіна, і чакала асуджэння за адкрытую вопратку ці распушчаныя валасы. Але скосых поглядаў не было – большасць стэрэатыпаў, асабліва рэлігійных, развеяліся пасля зносін з людзьмі.*

Многія міжнародныя праграмы адкрытыя для студэнтаў любых факультэтаў, але ёсць і вузкаспецыялізаваныя напрамкі, разлічаныя на канкрэтныя профілі навучання. Даведацца пра іх можна ў дэканаце або УМС БДУ.



Так, **Вікторыя Пруднікава**, студэнтка факультэта міжнародных адносін, выбрала для абмену Венгрыю. Пра магчымасць навучання дзяўчына даведалася праз універсітэт: паміж Беларуссю і Венгрыяй дзейнічае міжурадавае пагадненне, якое дазваляе студэнтам навучацца па абмене:

– *Мае аднагрупніцы з'ездзілі і засталіся ў захапленні. Таму я адразу вырашыла, што таксама паспрабую.*

Яе прынялі ў Печскі ўніверсітэт – найстарэйшую ВНУ Венгрыі з багатай гісторыяй і моцнай праграмай па міжнародных адносінах. Адбор праходзіў у два этапы: спачатку ў БДУ, потым у Міністэрстве адукацыі. Конкурс быў высокі, але дзяўчыне ўдалося трапіць у лік чатырох адабраных студэнтаў. Фармат вучобы аказаўся зусім новым:

– *Тут няма лекцый – увесь матэрыял мы абмяркоўваем адразу на занятках. Можна выбіраць прадметы па інтарэсах, і нават спорт, які хочаш. Атмасфера вельмі прыязная, пастаянна праходзяць мерапрыемствы, фестывалі, экскурсіі.*

Такая сістэма, па словах студэнткі, вучыць самастойнасці і адказнасці. А зносіны з замежнымі студэнтамі дапамагаюць удасканаліць англійскую мову і пашырыць кругагляд:

– *Абмен даў мне каласальны вопыт і новыя знаёмствы. Я палепшыла англійскую мову і пачала вучыць венгерскую.*

Сёння ў БДУ шырокая сетка міжнародных партнёраў: ад Расіі і Кітая да Калумбіі, Кубы і Зімбабвэ. З кожным годам такіх пагадненняў становіцца ўсё больш – гэта значыць, што любы студэнт можа знайсці праграму, якая падыходзіць менавіта пад яго спецыяльнасць і інтарэсы.

Па словах **Уладзіміра Галынскага, намесніка начальніка ўпраўлення міжнародных сувязяў БДУ**, штогод у праграмах акадэмічнага абмену ўдзельнічаюць ад 300 да 400 студэнтаў:

– *Кожны год мы ставім мэту па акадэмічнай мабільнасці. Напрыклад, летась яна складала 2% ад агульнай колькасці студэнтаў, і мы паспяхова яе выканалі.*

Самае актыўнае супрацоўніцтва ў БДУ з Кітаем і Расіяй. Напрыклад, з расійскімі ВНУ дзейнічае пагадненне па падрыхтоўцы спецыялістаў у ядзернай галіне: беларускія студэнты праходзяць практыку на профільных аб'ектах, каб далей працаваць на айчыннай атамнай станцыі.

Акрамя таго, у БДУ дзейнічаюць дамоўленасці з універсітэтамі Арменіі, Казахстана, Азербайджана, Кубы, Зімбабвэ, Амана, Бразіліі і іншых краін. Трапіць на навучанне можна ў любую з іх – галоўнае, каб падыходзіў сярэдні бал і факультэт даў згоду на ўдзел.

Тым, хто хоча паспрабаваць сябе ў **міжнародных праграмах,** варта пачаць з сайта УМС БДУ **mobility.bsu.by** (даступны толькі пры падключэнні да сеткі БДУ) – там рэгулярна публікуюцца актуальныя **аб'явы пра набор на абмены, стажыроўкі і летнія школы.** Пасля паспяховага пошуку праграмы неабходна падаць заяўку і папярэднія дакументы, з чым дапаможа дэканат факультэта і УМС. Пасля адабрэння заяўкі прымаючым універсітэтам пачнецца збор асноўных дакументаў і падрыхтоўка да паездкі.

Міжнародны абмен – гэта магчымасць прафесійнага і асабістага росту, знаёмства з іншымі культурамі і разуменне сваёй прафесіі ў глабальным кантэксце. БДУ працягвае актыўна развіваць міжнароднае супрацоўніцтва, і сёння ў кожнага студэнта ёсць магчымасць знайсці фармат пад сябе – навучанне на 6 месяцаў, год, летнюю школу, анлайн-курс або практыку за мяжой.

**Ксенія СМІРНОВА**

# НАТАЛЛЯ ПОКЛАД: «ЛІТАРЫНКА» – ГЭТА ВЯЛІКАЯ ДРУЖНАЯ СЯМ'Я

**У цэнтры ўвагі праекта «Размовы пра культуру і творчасць» дзіцячы ансамбль танца «Літарынка». Калектыў актыўна ўдзельнічае ў творчым жыцці БДУ і сталіцы. Пра гісторыю «Літарынкі», пастаноўку творчых нумароў і працу з дзецьмі распавяла мастацкі кіраўнік і балетмайстар ансамбля Наталля Поклад.**





Наша гераіня нарадзілася 12 снежня 1977 г. у г. п. Праўдзінскі Мінскай вобласці. Скончыла аддзяленне харэаграфіі дзіцячай школы мастацтваў. У 1994 г. паступіла ў Мінскае вучылішча мастацтваў (цяпер Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў і культуры) на аддзяленне харэаграфіі «народны танец». У 1998 г. пачала працаваць у ансамблі танца «Літарынка» ў якасці балетмайстра. У гэтым жа годзе паступіла на гістарычны факультэт БДУ. З 2010 г. з'яўляецца кіраўніком ансамбля. За гады працы ва ўніверсітэце была ўдастоена падзякі рэктара БДУ, ганаровых грамат.

**Як пачалася ваша прафесійная дзейнасць?**
Пачаткам майго шляху стала навучанне ў Мінскім вучылішчы мастацтваў. Падчас правядзення выпускных экзаменаў мне прапанавалі стаць удзельніцай заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля танца «Крыжачок» БДУ. Я з радасцю прыняла запрашэнне, але мяне не пакідала думка пра тое, што я мару працаваць з дзецьмі.

Надышоў момант, калі было неабходна афармляць дакументы. У той дзень я выпадкова пазнаёмілася з Канстанцінам Васільевічам Зубікам, кіраўніком дзіцячага танцавальнага калектыву «Літарынка». Падчас размовы высветлілася, што калектыву неабходны яшчэ адзін харэограф, стала зразумела, што гэта мой шанец. У 1998 г. я пачала працаваць.

Вельмі важным было тое, каб мяне прынялі і палюбілі дзеці. Усё атрымалася як мага лепш – і вось з 2010 г. я кіраўнік ансамбля.

**Распавядзіце, калі ласка, пра гісторыю стварэння «Літарынкі».**
У 1981 г. у БДУ быў створаны ансамбль танца для дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Тады ён называўся «Крынічка». Першым кіраўніком стала Яўгенія Вікенцьеўна Трыгубовіч. З 1986 г. кіраўнікамі былі Канстанцін Васільевіч Зубік і Таццяна Паўлаўна Зубік. У гісторыі пачаўся новы этап. Дзецям-удзельнікам ансамбля прапанавалі падумаць над новай назвай, і праз нейкі час і з'явілася «Літарынка». Дзеці хутка падхапілі ідэю пра тое, што, як з літар з'яўляюцца словы, так з рухаў з'яўляецца танец. Новая назва і замацавалася за калектывам.

**Як вы знаходзіце падыход да ўдзельнікаў ансамбля?**
У нашым калектыве займаюцца дзеці рознага ўзросту. Для кожнага з іх у мяне свой метад працы. Самым маленькім удзельнікам ансамбля – 5-6 гадоў. З імі мы праводзім усе заняткі ў выглядзе гульні. На такіх уроках знаходзіцца месца для смеху, жартаў і пераўвасаблення.

Наступная ўзроставая катэгорыя – дзеці 8-12 гадоў. Для іх я імкнуся быць сябрам. У гэтай групе мы шмат вучымся разам.

Старэйшая група – падлеткі 13-17 гадоў. З імі я імкнуся быць нароўні. Часта з дзяўчатамі старэйшай групы мы можам абмеркаваць нават нейкія жыццёвыя пытанні. Для мяне вельмі каштоўныя такія зносіны з дзецьмі. Мы сапраўды шмат чаму вучымся адно ў аднаго.

**Як праходзяць вашы рэпетыцыі?**
Нашы рэпетыцыі заўсёды праходзяць па-рознаму. Калі гэта звычайны ўрок, то, вядома, мы спачатку вітаемся. Пачынаецца размінка, затым трэнаж. Пасля гэтага развучваем новы матэрыял і займаемся пастановачнай працай.

Стварэнне танцавальных нумароў – гэта складаны шматэтапны працэс. Дзякуючы руплівай працы ў рэпертуары калектыву кожны год з'яўляюцца новыя пастаноўкі. Гэта адбываецца па-рознаму. Ёсць нумары, якія мы аднавілі пасля працяглага перапынку. Напрыклад, танец «Беларускі сувенір». Ёсць нумары, якія нараджаюцца спантанна, як жартоўны нумар «Кухцікі», дзе танчыла адразу некалькі членаў адной сям'і.

Нягледзячы на тое, што кожная ўзроставая група мае свой графік і рэжым працы, у нас ёсць сумесныя нумары ў калектыве. Так, малодшая група можа танчыць са старэйшай групай, ёсць агульныя нумары для ўсіх узроставых груп. Заўсёды прыемна глядзець, як дзяўчаткі з малодшай групы бяруць прыклад са старэйшых, як яны раяцца, удакладняюць нюансы. Падчас рэпетыцый усе актыўна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. Гэта выдатна! Дзякуючы гэтаму мы і ёсць вялікая дружная сям'я «Літарынка».

Ёсць выраз «танчыць ад шчасця». Я часта задумваюся, як важна танчыць для шчасця, бо танец – гэта від мастацтва, які можа натхняць і хваляваць гледачоў. А рэпетыцыі – пачатак цікавага творчага шляху.

**Якія танцы з рэпертуару ансамбля карыстаюцца найбольшай папулярнасцю?**
Нумары ансамбля танца «Літарынка» яскравыя і разнапланавыя. Гэта народныя, сюжэтна-гульнявыя, сучасныя эстрадныя танцы. Асабліва вылучаюцца танцавальныя нумары з беларускай тэматыкай, такія як «Полька-Янка», «Вяночак беларускіх танцаў», «Скокі» і інш. Вельмі цёпла гледачы заўсёды прымаюць жартоўныя нумары, напрыклад, «Гусак», «Кухцікі» і «Ухты!». Ёсць у рэпертуары ансамбля танцы народаў свету, напрыклад, рускія танцы «Матрошкі», «Калінка», італьянскі танец «Тарантэла», малдаўскі танец «Хора», іспанскі танец «Балеро».

**Хто можа стаць удзельнікам ансамбля «Літарынка»?**
У ансамблі займаюцца 4 рознаўзроставыя групы – падрыхтоўчая (першы год навучання) і асноўны склад, які ўключае малодшую, сярэднюю, старэйшую групу. Галоўным чынам у нас займаюцца дзеці выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ, але таксама ўдзельнікам калектыву можа стаць любы ахвотнік. Мы заўсёды рады бачыць новыя таленты ў нашай вялікай дружнай сям'і.

**Які самы яркі ўспамін, звязаны з «Літарынкай»?**
Такіх момантаў шмат. Ёсць адзін вельмі асабісты для мяне, калі ў дзяцінстве мая дачка Настачка аднойчы сказала, што ёй здаецца, быццам дзяцей з «Літарынкі» я люблю больш. Тады я вельмі доўга разважала і ўсвядоміла, як шмат месца ў маім жыцці адведзена ансамблю, што для мяне ён літаральна ўсё: гэта і дом, і сям'я, і маё жыццё ў прынцыпе. Гэты момант прымусіў пра многае задумацца.

Яшчэ адзін асаблівы ўспамін – мой першы выезд з ансамблем на міжнародны фестываль танца ў 1999 г., які праходзіў у Турцыі. Запомніўся момант адкрыцця фестывалю, калі мы ў калоне неслі сцяг БДУ і Рэспублікі Беларусь, а нас цёпла віталі гледачы. Гэта быў момант, напоўнены асаблівым гонарам і радасцю.

**У чым, на ваш погляд, унікальнасць ансамбля?**
Дзіцячы ансамбль «Літарынка» – гэта вялікая дружная сям'я. Гэта месца, дзе чакаюць і любяць кожнага, дзе вырасла не адно пакаленне таленавітых дзяцей. Я ганаруся тым, што ў наш калектыў прыходзяць дзеці выпускнікоў ансамбля танца «Літарынка», што яны танчыць тыя танцы, якія калісьці танчылі іх бацькі. У нумарах нашага калектыву часта бяруць удзел мамы і таты. Я вельмі ўдзячная бацькам за тое, што яны заўсёды ідуць насустрач, прымаюць актыўны ўдзел у жыцці ансамбля і падтрымліваюць нашы ідэі – і захоўваюць тым самым асаблівую сувязь пакаленняў. Гэта робіць калектыў унікальным.

**Ці ёсць у вашым калектыве адмысловыя традыцыі?**
Так, вядома. На стары новы год мы праводзім сумесныя творчае мерапрыемства, дзе бяруць удзел і бацькі, і выпускнікі, і дзеці. І, каб было цікавей, мы кожны год выбіраем пэўную тэматыку. Вельмі запомнілася свята ў стылі «Героі казак». Усе актыўна рыхтаваліся: рабілі касцюмы і прыдумлялі для іх прэзентацыі. Вечар атрымаўся сапраўды казачным. Самае галоўнае, што гэтыя мерапрыемствы – выдатная магчымасць для дзяцей і бацькоў правесці больш часу разам. Мамы і таты заўсёды вельмі ўдзячныя за такую магчымасць.

**Якім вы бачыце ансамбль у будучыні?**
У наступным годзе калектыў адзначыць 45-годдзе. Мы актыўна рыхтуемся да гэтай даты і запланавалі шмат цікавых сюрпрызаў. Я ўпэўнена, што калектыў працягне расці і радаваць гледачоў.

## ДАВЕДКА

Дзіцячы ансамбль танца «Літарынка» – гэта:
- 44 гады творчай дзейнасці
- Рэгулярныя канцэрты і выступленні
- Народныя, сюжэтна-гульнявыя, сучасныя эстрадныя танцы
- Пераможца рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў
- Уладальнік гран-пры
- Удзельнік дабрачынных праектаў

**Дар'я АРТАМОНАВА**
**Фота: прэс-служба БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
21 лістапада 2025 года, №11 (2302)

# WELCOME WEEK BSU: ЛЁГКІ СТАРТ ДЛЯ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ




*Вэнь Юйкэ, старшыня савета зямляцтваў БДУ*





**Праект для замежных студэнтаў Welcome Week BSU адбыўся ў БДУ. Каля 50 навучэнцаў прынялі ўдзел у мерапрыемстве. Арганізатарамі выступілі ўпраўленне па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце і савет зямляцтваў ВНУ.**

Яшчэ ў 2021 годзе рэалізацыя ідэі праходзіла ў тэставым рэжыме, а сёння адзначыла пяцігадовы юбілей. Welcome Week не проста мерапрыемства, а цэлая філасофія адаптацыі, сяброўства і ўзаемаразумення паміж студэнтамі з розных краін. Праект, народжаны са сціплай ідэі савета зямляцтваў БДУ, за некалькі гадоў ператварыўся ў значную падзею, якая вызначае першыя крокі многіх замежных студэнтаў у новым для іх адукацыйным асяроддзі і краіне.

Ініцыятыва мае выразную праграму, закліканую забяспечыць камфортнае і эфектыўнае знаходжанне замежных навучэнцаў у БДУ і ў Рэспубліцы Беларусь у цэлым. У яго аснове ляжыць глыбокая павага да беларускіх нацыянальных традыцый і культуры, а таксама да традыцый і звычаяў замежных студэнтаў, якія прыбываюць у краіну з самых розных куткоў свету. Welcome Week імкнецца ствараць гарманічнае асяроддзе, дзе кожны студэнт адчувае сябе часткай вялікай і дружнай універсітэцкай сям'і.

Праект ставіць мэту: зрабіць так, каб студэнты разумелі і паважалі законы і культуру краіны, у якой яны навучаюцца. Патрэбна, каб хлопцы і дзяўчаты хутка асвоіліся ва ўніверсітэце і адчувалі сябе тут як дома. Яшчэ адна задача – паказаць, што БДУ – гэта не проста месца для вучобы, а цэнтр, дзе можна знайсці сяброў з усяго свету, рэалізаваць свае таленты і атрымаць якасную адукацыю. І, вядома, Welcome Week прапагандуе здаровы лад жыцця, бо вучоба і спорт – выдатнае спалучэнне.

За ўсё гэта адказвае савет зямляцтваў БДУ. У яго склад уваходзяць маладыя людзі, якія дапамагаюць замежным студэнтам знайсці агульную мову з адміністрацыяй універсітэта, падтрымліваюць нацыянальныя суполкі і арганізуюць сумесныя мерапрыемствы. Яны заўсёды гатовыя абараніць правы і інтарэсы студэнтаў, а таксама дапамагчы ўвасобіць у жыццё самыя смелыя ідэі. Савет зямляцтваў імкнецца зрабіць жыццё ў БДУ цікавым і насычаным, арганізоўваючы культурныя і спартыўныя падзеі, прэзэнтацыі, выставы і сустрэчы з цікавымі людзьмі.

У праекце Welcome Week ёсць усё неабходнае: сустрэчы з прадстаўнікамі ўніверсітэта, пазнавальныя лекцыі пра законы і культуру Беларусі, экскурсіі па горадзе і ўніверсітэце, а таксама спартыўныя спаборніцтвы і культурныя мерапрыемствы. Дзякуючы такому падыходу замежныя студэнты хутка ўліваюцца ў студэнцкае жыццё, знаходзяць новых сяброў і пачынаюць адчуваць сябе часткай вялікай універсітэцкай сям'і.

Пра тое, што змянілася за пяць гадоў і як студэнты адгукаюцца пра нашу краіну, распавёў старшыня савета зямляцтваў БДУ **Вэнь Юйкэ**:

*– У гэтым годзе наш праект стаў больш маштабным: колькасць удзельнікаў павялічылася да 50 чалавек з розных краін – Расіі, Кітая, Таджыкістана, Арменіі, Азербайджана, Казахстана. За пяць гадоў павялічылася колькасць мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў рамках праекта: стала больш турыстычных экскурсій, а таксама лекцый з адміністрацыяй і рознымі структурамі БДУ. Акрамя таго, у гэты раз было больш кітайскіх студэнтаў, што вельмі радуе. Пра Беларусь усе адгукаліся з цікавасцю: казалі, што гэта спакойная краіна, а горад Мінск ім вельмі спадабаўся. Вядома, усе адзначалі, што ёсць культурныя і традыцыйныя адрозненні паміж Беларуссю і іх краінамі, але ўражанні ў іх засталіся добрыя,* – падзяліўся старшыня.

У межах праграмы студэнты сустрэліся з куратарамі, даведаліся пра будучыя мерапрыемствы і прадставілі свае краіны, што заклала аснову для далейшых зносін.

Затым удзельнікі пазнаёміліся з універсітэтам. Экскурсія ў музей землязнаўства дазволіла даведацца пра гісторыю і навуковыя дасягненні БДУ. Знаёмства са студэнцкім гарадком дапамагло разабрацца ў бытавых пытаннях і садзейнічала стварэнню камфортнага асяроддзя.

Важным этапам сталі сустрэчы з прадстаўнікамі ўпраўленняў. З супрацоўнікамі міжнароднага аддзела абмяркоўваліся пытанні правоў і абавязкаў замежных грамадзян, з прадстаўнікамі аддзела па выхаваўчай рабоце – магчымасці ўдзелу ў грамадскім жыцці ўніверсітэта.

Праграма завяршылася экскурсіяй па Мінску і наведваннем Нацыянальнай бібліятэкі. Удзельнікі ўбачылі прыгажосць горада, дакрануліся да беларускай гісторыі і культуры, пазнаёміліся з багатай калекцыяй кніг. Усё гэта дазволіла замежнікам адчуць сябе часткай беларускага грамадства.

У канцы праекта студэнты атрымалі сертыфікаты, але галоўнае – неацэнны досвед, новыя веды, сябры і ўпэўненасць у сабе. Welcome Week – гэта старт вялікага і цікавага шляху, поўнага магчымасцяў і адкрыццяў у БДУ.

**Аляксандра Ларыос, 4 курс, хімічны факультэт.**

– Праект мяне глыбока ўразіў. Калі я ўдзельнічала ў ім упершыню, яшчэ тры гады таму, ён стаў для мяне сімвалам пачатку новага жыцця – універсітэцкага, самастойнага. Тады я адчула атмасферу падтрымкі, адкрытасці і дабрыні, якая дапамагае першакурснікам хутка адаптавацца.

Сёлета я ўдзельнічала ўжо як арганізатар, і гэта быў зусім новы досвед. Я зразумела, колькі высілкаў і энтузіязму патрабуецца, каб стварыць тыя самыя моманты, што запамінаюцца студэнтам на многія гады. Працоўны вопыт у камандзе, магчымасць бачыць вынік сваёй працы і радасць у вачах удзельнікаў – гэта натхняе і матывуе рухацца далей. Welcome Week стаў для мяне напамінам, што нават праз гады можна адчуць тую ж радасць і адзінства, што і ўпершыню.

**Го Цзіньхань, аспірант эканамічнага факультэта.**

– Як замежны студэнт, які прыехаў нядаўна, я сапраўды адчуў супакой дзякуючы вітальнай тыднёвай праграме Міжнароднай студэнцкай асацыяцыі. Здавалася, амаль кожная дэталь была прадумана так, каб зняць тую пачатковую збянтэжанасць і трывогу, якія мы адчулі па прыездзе.

Найбольш уразіў мяне інструктаж па мясцовых прававых пытаннях. Ад правілаў дарожнага руху да візавых патрабаванняў і ўмоў пражывання – усё было напоўнена практычнай інфармацыяй. Гэта было тое самае «кіраўніцтва па выжыванні», якое нам так неабходна было ведаць. Пасля гэтага раней страшныя правілы раптам сталі зразумелымі, і мая трывога сціхла. Яшчэ больш нечаканым стала тое, што арганізавалі спецыяльную псіхалагічную кансультацыю. У той момант я зразумеў, што нехта сапраўды клапоціцца, каб мы не адчувалі адзіноты і непакою.

Шчыра кажучы, дзякуючы гэтым мерам я адчуў, што ўніверсітэцкія арганізацыі сапраўды нас разумеюць. Яны не абмяжоўваліся павярхоўнымі намаганнямі, а сапраўды працягнулі руку дапамогі там, дзе яна была патрэбная больш за ўсё. Такі прыём быў асабліва цёплым.

**Цзоу Цзіньюнь, магістрант эканамічнага факультэта.**

– На працягу гэтых некалькіх дзён мерапрыемствы «Тыдня прыёму» цалкам адпавядалі нашым патрэбам як замежных студэнтаў – гэта было вельмі практычна. Асабліва карысным стала знаёмства з нюансамі мясцовага заканадаўства. Пасля гэтай лекцыі мы нарэшце перасталі панікаваць, гледзячы на мноства незнаёмых правілаў.

Пазней, наведаўшы Нацыянальны музей і геаграфічны музей, назіраючы за экспанатамі, якія расказвалі пра гісторыю і геаграфію краіны, мы атрымалі больш канкрэтнае ўяўленне пра гэта раней незнаёмае месца. Да таго ж, магчымасць скарыстацца псіхалагічным кансультаваннем дапамагла нам пазбавіцца ад нябачных трывог.

Універсітэт сапраўды дасягнуў узаемаразумення са студэнтамі, іх арганізацыі максімальна ўлічвалі нашы патрэбы – гэта аказала вялікую дапамогу ў адаптацыі.

**Таццяна САВІЦКАЯ**

# ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ ЗНУТРЫ: ЯК У БДУ ДАПАМАГАЮЦЬ ШКОЛЬНІКАМ З ВЫБАРАМ ПРАФЕСІІ

**Адчуць сябе студэнтам галоўнай ВНУ краіны, яшчэ не здаўшы выпускныя экзамены, не мара, а рэчаіснасць для ўдзельнікаў унікальнага праекта БДУ. За некалькі дзён яны паспяваюць не толькі трапіць на пары і паразмаўляць з выкладчыкамі, але і знайсці сяброў. «Студэнт БДУ на тыдзень» – гэта ўнікальны мост паміж школай і ўніверсітэтам, які штогод дапамагае дзясяткам абітурыентаў зрабіць усвядомлены выбар. За яго паспяховай рэалізацыяй стаіць каманда энтузіястаў на чале з куратарам Архіпам Палуянавым, а каштоўнасць праекта лепш за ўсё пацвярджаюць яркія ўражанні яго ўдзельнікаў.**



Архіп Палуянаў узначаліў праект «Студэнт БДУ на тыдзень» па рэкамендацыі папярэдняга кіраўніка Дар'і Палуйкі. Да гэтага ён займаў пасаду яе намесніка і шмат чаму навучыўся за час сумеснай працы.

З праектам ён быў знаёмы ўжо некалькі гадоў. Яшчэ ў 14-м сезоне, вясной 2023 года, прымаў у ім удзел у якасці студэнта на тыдзень на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі.

Як адзначыў Архіп, адбор школьнікаў праводзіцца на аснове пададзенай заяўкі і матывацыйнага ліста на тэму «Чаму я хачу стаць студэнтам БДУ на тыдзень?». На трох факультэтах – ФМА, журфаку і ФПМІ – прадугледжаны таксама другі, творчы этап, дзе ўдзельнікі атрымліваюць дадатковыя заданні. Вопыт уласнага ўдзелу ў праекце дапамагае яму разумець, як школьнікі рыхтуюцца да студэнцкага жыцця.

Куратары-студэнты разам з выкладчыкамі і адміністрацыяй факультэтаў складаюць для школьнікаў расклад, арганізоўваюць тымбілдынгі і нефармальныя сустрэчы.

– *Наогул, мы імкнёмся рабіць усё для таго, каб перадаць менавіта настрой студэнцтва,* – каментуе малады чалавек.

Ключавое адрозненне праекта ад стандартных дзён адчыненых дзвярэй у ступені заглыблення абітурыента ў жыццё факультэта.

– *Унікальнасць праекта ў тым, што мы даём магчымасць заглыбіцца ў студэнцтва, застаючыся школьнікамі. Гэта дапамагае ўдзельнікам знайсці адказ на важнае пытанне: «А кім я стану, калі вырасту?»*

Пры рэалізацыі праекта ўзнікае шэраг цяжкасцяў, аднак актыўную падтрымку аказвае цэнтр прафарыентацыі, студэнцкага адміністравання і працаўладкавання. Асабліва кіраўнік адзначае дапамогу Ксеніі Чэсюнайце, якая з увагай падыходзіць да ўсіх нюансаў падрыхтоўкі. Як заўважаюць арганізатары, цікавасць да праекта расце: у сёлетнім сезоне было пададзена каля 700 заявак, што ўдвая больш, чым у папярэднім.

– *У наступным сезоне, які будзе юбілейным, 20-м, мы спадзяёмся пераадолець мяжу ў 1000 заявак ад школьнікаў,* – дадае Архіп.

Планы па развіцці маштабныя, ідэй вельмі многа, кіраўнікі ўпэўненыя, што змогуць здзейсніць шкоднае задуманае праект не толькі дапамагае абітурыентам, але і збліжае студэнтаў і выкладчыкаў, спрыяючы развіццю навыкаў арганізацыі і кіравання. Безумоўна, праект павышае зацікаўленасць абітурыентаў паступаць менавіта ў БДУ – самую аўтарытэтную ВНУ краіны.



Удзельніца праекта Паліна Сыцько вырашыла прыняць удзел, каб лепш пазнаёміцца з абранай спецыяльнасцю і ўніверсітэцкім жыццём. Яе першы дзень быў насычаным і цікавым: пачалося ўсё з інструктажу па тэхніцы бяспекі, затым было знаёмства з куратарамі і іншымі ўдзельнікамі, а пасля адбылася пара па неарганічнай хіміі разам з першакурснікамі.

Асабліва ўразілі дзяўчыну лекцыі па фізіцы, радыяцыйнай і ядзернай бяспецы, а таксама практычныя заняткі. Лекцыя па фізіцы запомнілася змястоўнасцю і займальнай падачай. У апошні дзень праекта Паліна змагла асабіста паўдзельнічаць у мерапрыемстве «Віртуозы навукі».

– *Атмасфера ва ўніверсітэце, уключаючы лекцыі, практыкумы і нават каву з аўтамата, пакінула прыемныя ўражанні. За тыдзень я пазнаёмілася са многімі студэнтамі і канчаткова ўпэўнілася ў жаданні паступаць на хімічны факультэт па спецыяльнасці «хімія лекавых злучэнняў».*

Школьніца рэкамендуе праект сябрам, бо ўсяго за адзін тыдзень адкрыла для сябе шмат новага, атрымала інфармацыю пра будучую прафесію і пазнаёмілася з цікавымі людзьмі.



Ксенія Самсонава першапачаткова планавала паступаць на факультэт радыёфізікі, але праграма дапамагла канчаткова пераканацца ў гэтым рашэнні. Больш за ўсё дзяўчыне запомніліся лекцыі і практычныя заняткі, прысвечаныя аэракасмічным тэхналогіям. Магчымасць дакрануцца да такіх незвычайных праектаў яна ацэньвае як каштоўны досвед.

Добразычлівая і сяброўская атмасфера факультэта ўразіла аўтэнтычнасцю. Студэнты і выкладчыкі былі адкрытыя да зносін, гатовыя падтрымаць размову. А праект дапамог канчаткова вызначыцца з выбарам. Цяпер дзяўчына ведае, што гэта дакладна яе факультэт. Усведамленне прыйшло пасля заглыблення ў студэнцкае жыццё.

– *Калі б трэба было апісаць праект адной фразай, гэта быў бы «добры экспірыенс», які можна перажыць толькі адзін раз, але які падараваў унікальныя эмоцыі і цалкам змяніў уяўленне пра факультэт,* – падсумоўвае Ксенія.



Ангеліна Пірштук даведалася пра магчымасць стаць студэнткай яшчэ ў 10 класе, але тады не адважылася падаць заяўку. Пасля заканчэння навучальнага года яна пачала сумнявацца ў выбары паміж лагістыкай і міжнароднымі адносінамі, што і падштурхнула яе прыняць удзел у праекце для больш глыбокага знаёмства з універсітэтам і спецыяльнасцямі. За чатыры дні праекта яна атрымала адказы на ўсе свае пытанні і правяла час сярод цудоўных людзей.

– *Калі я прыехала, то зразумела, што ФМА – гэта пра людзей. Менавіта калектыў факультэта дапамог стварыць незабыўныя ўражанні і накіраваў мяне на правільны шлях,* – дадае Ангеліна.

Першы час дзяўчыне было нязвыкла сядзець на парах даўжэй за 45 хвілін, але рытм ФМА хутка стаў камфортным. Цяпер яна цалкам асвоілася, і вяртанне ў школу будзе няпростым. Выкладчыкі прыемна здзівілі сваёй энергічнасцю і матываванасцю. Асаблівае ўражанне пакінулі заняткі па французскай мове. Таксама яе ўразіла праца куратараў і кіраўніцы Настассі, за што яна выказвае ім вялікую падзяку.

Удзел у мадэляванні сесіі ААН спачатку выклікаў асцярогі, але страх хутка сышоў, калі людзі вакол пачалі падтрымліваць адзін аднаго. Такі вопыт дапамог усвядоміць, што праца дыпламата складаная, але менавіта гэтая складанасць матывуе вывучаць больш моў.

Ва ўніверсітэце вучаніцу старэйшых класаў уразілі лёгкасць у зносінах і зацікаўленасць людзей. Выкладчыкі разумелі навучэнцаў і выявіліся цікавымі апавядальнікамі. Успрыманне ўніверсітэта змянілася ў лепшы бок.

– *Першапачаткова я баялася паступаць, а цяпер разумею, што не хачу пакідаць БДУ. Праект шмат чаму навучыў мяне, за што вельмі ўдзячная ўсім арганізатарам. Універсітэт пацвердзіў правільнасць абранага напрамку. Хаця я і наведала пары розных факультэтаў, міжнародныя адносіны засталіся спецыяльнасцю, пра якую хочацца даведацца больш у будучыні.*



Кацярына Пагуляева даведалася пра «Студэнта БДУ на тыдзень» зусім выпадкова, ад сяброўкі, і адразу вырашыла дзейнічаць. Яна хутка падрыхтавала матывацыйны ліст для факультэта журналістыкі, а пасля праходжання ў другі этап актыўна працавала над творчым заданнем.

Будучая абітурыентка плануе паступаць у 2026 годзе і гатова прыкладаць усе намаганні для дасягнення мары. Праект прывабіў яе магчымасцю ўбачыць студэнцкае жыццё знутры.

Першы дзень прайшоў ярка і насычана: афіцыйнае адкрыццё, экскурсія па факультэце, некалькі заняткаў, агульнаўніверсітэцкае адкрыццё і сустрэча са студэнтамі-валанцёрамі «школы малады журналістаў». Асабліва запомніўся тымбілдынг, дзе ўдзельнікі стварылі крэатыўныя плакаты і знаёміліся адзін з адным.

«Журфак – гэта людзі» – менавіта чалавечыя адносіны сталі галоўным адкрыццём праекта. За чатыры дні яна сустрэла неверагодную колькасць адкрытых і творчых асоб, з якімі было цяжка развітацца.

– *Спадабаліся ўсе пары, дзе прысутнічалі творчыя заданні. Але нават тэарэтычныя заняткі былі займальнымі дзякуючы выкладчыкам. Праект дапамог мне вызначыцца з напрамкам: калі некаторыя ўдзельнікі зацікавіліся інфакамам, то я канчаткова ўпэўнілася ў выбары журналістыкі.*

Так, крок за крокам, ад знаёмства з куратарамі да развітальных абдымкаў, і нараджаецца менавіта тая чароўнасць «студэнцтва на тыдзень». Розныя факультэты, розныя мары, але адзін і той жа вынік – запал у вачах і цвёрдая ўпэўненасць у сваім выбары. «Я абавязкова сюды вярнуся» – гэтая фраза гучыць з вуснаў кожнага ўдзельніка і з'яўляецца самым лепшым доказам поспеху праекта. Ён запаліў іскру, якая хутка разгарыцца ў полымя сапраўднага студэнцкага жыцця ў сценах галоўнай ВНУ краіны.

**Марыя КАРКВЕЛІС**

УНІВЕРСІТЭТ
21 лістапада 2025 года, №11 (2302)

## НАВІНЫ МІНСКА | БЕЛАРУСІ

У 2026/2027 навучальным годзе ў БДУ пачне працу Вышэйшая школа прыродазнаўчых навук і тэхналогій. Навучанне будзе весціся па пяці эксперыментальных праграмах, якія аб'ядноўваюць фізіку, матэматыку, хімію, геаграфію і сучасныя тэхналогіі. Рэктар Андрэй Кароль адзначыў, што школа працягне курс на абнаўленне адукацыі і будзе працаваць па новай мадэлі, заснаванай на індывідуалізацыі, інтэнсіўнасці і практыкаарыентаванасці. Студэнтаў чакаюць пяцігадовае навучанне, рэгулярная практыка ў навуковых цэнтрах і на прадпрыемствах, а таксама праекты, якія могуць быць укаранёны ў рэальную вытворчасць. Паступіць у школу змогуць перш за ўсё адораныя навучэнцы, для якіх прадугледжана ўнутранае сумоўе і экзамены.

На Мінск прыйшлося 14,1 % аб'ёму ўводу жылля ў Беларусі за 10 месяцаў.

Зборнікі вершаў народнага паэта Беларусі Янкі Купалы былі перададзены Інстытуту замежных моў Ханойскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гэта адбылося ў рамках святкавання 70-годдзя факультэта рускай мовы і літаратуры, дзе адбылася сустрэча пасла Беларусі ў В'етнаме Уладзіміра Баравікова з прарэктарам ВНУ Хоа Нгок Шонам. Бакі абмеркавалі бягучы стан і перспектывы беларуска-в'етнамскага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі. Пасол перадаў ва ўніверсітэцкую бібліятэку 10 асобнікаў зборніка Купалы.

У Нацыянальным гістарычным музеі прадставілі выставачны праект «Музей ёлачных цацак», які дазволіць наведвальнікам да канца лютага акунуцца ў атмасферу навагодняга чараўніцтва. Экспазіцыя ўключае калекцыю ўпрыгожванняў з розных краін свету і распавядае гісторыю вытворчасці ёлачных цацак з XIX стагоддзя да сучаснасці. Сумесна з фабрыкай «ГРАЙ» выставу штогод папаўняюць унікальнымі экспанатамі, сярод якіх новыя цацкі з Амана, Мадагаскара, Афганістана і іншых краін. Госці змогуць убачыць рэдкія еўрапейскія і савецкія ўпрыгажэнні, а таксама здзейсніць своеасаблівае віртуальнае падарожжа па навагодніх традыцыях розных народаў.

XV Мінскі міжнародны Калядны оперны форум адкрыецца 11 снежня ў Вялікім тэатры Беларусі і збярэ вядучых майстроў опернага мастацтва. У праграме – прэм'ерныя спектаклі беларускай трупы, гала-канцэрты з удзелам сусветных зорак і паказ знакавых пастановак замежных тэатраў. Форум пачнецца операй «Арлеанская дзева», а ў наступныя дні гледачам прадставяць «Яўгена Анегіна» і прэм'еру «Ацыса і Галатэі». Паказы стануць важнай часткай «года Чайкоўскага» і завершацца канцэртам лаўрэатаў конкурсу вакалістаў імя Глінкі.

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб'яўляе конкурс

## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| **Прафесар** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук ці навуковае званне прафесара, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| | [2] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| **Дацэнт** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| **Старшы выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |
| **Выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 1 год. |
| **Асістэнт** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 1 год. |

**Інстытут бізнесу БДУ аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры лічбавых сістэм і тэхналогій (2) | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры бізнес-адміністравання | 3 гады |

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 203; да 20 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, аўд. 106; да 19 студзеня.

**Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры рэлігіязнаўства | 1 год |
| Загадчык кафедры біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння | 1 год |
| Загадчык кафедры багаслоўя | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, пр. Незалежнасці, 24, каб. 302; да 20 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, пр. Незалежнасці, 24, каб. 301; да 19 студзеня.

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

**Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі аб'яўляе конкурс за замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Старшы выкладчык кафедры геаграфічнай экалогіі | – |
| Старшы выкладчык кафедры эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі | – |
| Старшы выкладчык кафедры глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм | – |
| Выкладчык кафедры фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій | – |
| Выкладчык кафедры глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм (2) | – |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 314; да 20 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 213; да 19 студзеня.

**Факультэт міжнародных адносін аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры англійскай мовы міжнароднай прафесійнай дзейнасці [2] | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры міжнародных адносін (3) | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры ўсходазнаўства | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры ўсходазнаўства | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры ўсходазнаўства (2) | – |
| Старшы выкладчык кафедры рамана-германскіх моў міжнароднай прафесійнай дзейнасці | – |
| Старшы выкладчык кафедры міжнародных эканамічных адносі | – |
| Выкладчык кафедры ўсходазнаўства | – |
| Выкладчык кафедры рамана-германскіх моў міжнароднай прафесійнай дзейнасці | – |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 504; да 20 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 516; да 19 студзеня.

**Хімічны факультэт БДУ аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры высокамалекулярных злучэнняў | 3 гады |
| Дацэнт кафедры фізічнай хіміі і электрахіміі (3) | 1 год |
| Дацэнт кафедры высокамалекулярных злучэнняў | 2 гады |
| Дацэнт кафедры высокамалекулярных злучэнняў | 1 год |
| Асістэнт кафедры арганічнай хіміі | – |
| Асістэнт кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі | – |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203; да 20 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203; да 19 студзеня.

**Фізічны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры біяфізікі [2] | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела і нанатэхналогій | 1 год |
| Дацэнт кафедры біяфізікі | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі | – |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 315; да 20 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г, Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 326; да 19 студзеня.

**Гістарычны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры крыніцазнаўства | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры гісторыі новага і найноўшага часу | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры гісторыі Расіі | – |
| Старшы выкладчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін | – |
| Старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў | – |
| Выкладчык кафедры крыніцазнаўства | – |
| Выкладчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін | – |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
Гістарычны факультэт, вул. Чырвонаармейская, 6, аўд. 203; да 20 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
Гістарычны факультэт, вул. Чырвонаармейская, 6, аўд. 208; да 19 студзеня.

**Юрыдычны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры паліталогіі | 5 гадоў |
| Загадчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры крымінальнага права | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры паліталогіі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права | 1 год |
| Дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права | 1 год |
| Дацэнт кафедры крымінальнага права | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права (2) | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду (2) | 1 год |
| Дацэнт кафедры дзяржаўнага кіравання (3) | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры гаспадарчага права | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры канстытуцыйнага права (2) | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права (2) | – |
| Старшы выкладчык кафедры грамадзянскага права | – |
| Выкладчык кафедры канстытуцыйнага права | – |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: вул. Ленінградская, 8, кабінет 220; да 20 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: вул. Ленінградская, 8, кабінет 104; да 19 студзеня.

**Эканамічны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры інаватыкі і прадпрымальніцкай дзейнасці | 2 гады |
| Дацэнт кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 20 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 19 студзеня.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 21.11.2025 г.
Зак. 1039. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123,
Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by